**ПРАГРАМЫ ДВУХ ДЫПЛОМАЎ**
БДУ пашырае супрацоўніцтва з Універсітэтам прыкладных навук Мітвайда (Германія)
Стар. 2

**НОВЫ ТРЫУМФ ГАЗЕТЫ БДУ**
«Універсітэт» стаў пераможцам XV Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара»
Стар. 3

**ПА СЛЯДАХ ПРОДКАЎ**
Што могуць расказаць нашы прозвішчы? Тлумачыць прафесар Ірына ГАПОНЕНКА
Стар. 4

**«ПАМІЖ НАМІ ЗНАЧНА БОЛЬШ АГУЛЬНАГА»**
У спецпраекце – Раміль ГУСЕЙНАЎ з Азербайджана
Стар. 7

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

29 мая 2019 года, № 8 (2214)




Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

# У БДУ абноўлена Дошка гонару

Урачыстая цырымонія прайшла 15 мая з удзелам галоўных герояў гэтай падзеі – 32 супрацоўнікаў і 32 студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ, выявы і імёны якіх занесены на Дошку гонару.

Падрабязнасці на стар. 3












## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

**РЭКТАР БДУ Андрэй Кароль** стаў факеланосцам па Гродзенскай вобласці эстафеты II Еўрапейскіх гульняў «Полымя свету». Ён пранёс агонь па вуліцах абласнога цэнтра, куды прыбыла эстафета 18 мая з Брэсцкай вобласці.

Права несці агонь атрымліваюць прадстаўнікі розных сфер, якія дасягнулі высокіх вынікаў у дзейнасці, уславілі свой рэгіён і краіну.

У лік факеланосцаў Гродзенскай вобласці ўвайшлі тытулаваныя спартсмены: алімпійская чэмпіёнка па спартыўнай гімнастыцы **Алена Валчэцкая**, чэмпіён свету ў кіданні молата **Іван Ціхан**, стралкі **Віталь Бубновіч** і **Ігар Басінскі** і інш.

БДУ з'яўляецца афіцыйным партнёрам міжнароднага турніру і мае адну з самых прадстаўнічых дэлегацый валанцёраў на гэтых гульнях у колькасці звыш 1700 чалавек.

II Еўрапейскія гульні пройдуць у Мінску з 21 па 30 чэрвеня. Больш за 4 тысячы атлетаў з 50 краін аспрэчаць 200 камплектаў узнагарод у 15 відах спорту.

**ДЭЛЕГАЦЫЯ** Цэнтра даследаванняў праблем развіцця пры Дзяржаўным савеце КНР на чале з віцэ-прэзідэнтам **Чжэнам Цінчунам** наведала БДУ.

Сярод асноўных задач цэнтра: вывучэнне пытанняў нацыянальнай эканомікі, сацыяльнага развіцця і палітыкі рэформаў і адкрытасці, фарміраванне аб'ектыўнай ацэнкі палітычных рашэнняў, падача ЦК партыі і Дзяржсавету кансультатыўных заключэнняў. Віцэ-прэзідэнта цікавілі падраздзяленні БДУ, якія займаюцца эканамічнымі даследаваннямі, і перспектыўнасць усталявання з імі супрацоўніцтва.

Рэктар БДУ Андрэй Кароль адзначыў плённае ўзаемадзеянне з Кітаем, дзе ключавым звяном з'яўляецца РІКК. Новай формай кааперацыі стала сумесная падрыхтоўка спецыялістаў на першай ступені адукацыі. Андрэй Кароль распавёў пра адкрыццё на базе БДУ і ДПУ сумесных інстытутаў па навучанні беларускіх і кітайскіх студэнтаў па шэрагу спецыяльнасцяў.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
29 мая 2019 года, № 8 (2214)

# Вучыць студэнтаў быць творцамі сваіх ведаў

Пытанні метадалогіі, зместу і практыкі крэатыўнай адукацыі абмеркавалі 17 мая на круглым стале з удзелам рэктара БДУ Андрэя КАРАЛЯ, галоўнага рэдактара навукова-тэарэтычнага часопіса «Педагогіка» Руслана БОЗІЕВА (Расія).




Да дыскусіі далучыліся таксама навуковы рэдактар часопіса «Педагогіка» **Ганна Максаева**, дэкан механіка-матэматычнага факультэта **Дзмітрый Мядзведзеў**, прафесар кафедры тэорыі функцый **Наталля Броўка**, прафесар кафедры культуралогіі факультэта сацыякультурных камунікацый **Святлана Снапкоўская**, загадчыца кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта **Аксана Здрок**, загадчыца кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі **Вольга Жук**, загадчыца вучэбна-метадычнай лабараторыі інавацый у адукацыі **Наталля Марозава**.

У ліку актуальных тэм сучаснай адукацыі – місія класічнага ўніверсітэта, падрыхтоўка запатрабаванага спецыяліста, актывізацыя крэатыўнага мыслення і развіцця творчага патэнцыялу навучэнца.

Прадстаўніцтва рознага профілю абумоўлена важнасцю заяўленых пытанняў для прыродазнаўчанавуковых і гуманітарных факультэтаў, а таксама абменам досведам і вынікамі ўкаранення новых формаў і прыёмаў у навучальны працэс.

Падчас сустрэчы абмеркаванне праходзіла ў разрэзе трох блокаў пытанняў: трансфармацыя адукацыйнага асяроддзя ў рамках праграмы «Універсітэт 3.0»; праектаванне і рэалізацыя тэхналогій крэатыўнай адукацыі; тэарэтычныя асновы і практыка рэалізацыі вочна-дыстанцыйнага арганізацыйна-дзейнаснага курса «Методыка навучання праз адкрыццё: як навучаць усіх па-рознаму, але аднолькава».

БДУ для правядзення круглага стала па дадзенай тэматыцы абраны невыпадкова. Вядучая ВНУ Беларусі, як падкрэсліў рэктар **Андрэй Кароль**, характарызуецца фундаментальнасцю, мае навуковыя школы рознага кірунку і з'яўляецца цэнтрам розных поглядаў на пытанні зместу і мэт адукацыі. Канцэптуальныя рашэнні ўзнікаюць дзякуючы розным меркаванням. Акрамя таго, у БДУ сфарміравана і ўкаранёна сістэма крэатыўнай адукацыі, маецца наглядная база інавацыйных методык і формаў падрыхтоўкі спецыялістаў. Рэгулярна праводзяцца семінары па фарміраванні эўрыстычных якасцяў педагога, здольнага індывідуалізаваць працэс падрыхтоўкі студэнтаў, стварыць умовы для раскрыцця яго творчага патэнцыялу. Функцыянуе міжуніверсітэцкі партал «Метадалогія, змест, практыка крэатыўнай адукацыі», на ўсіх факультэтах вядзецца праца па ўкараненні крэатыўных формаў навучання.

У рамках сустрэчы выкладчыкі БДУ распавялі таксама пра сваю практыку выкарыстання інавацый, спецыфіку падрыхтоўкі спецыялістаў, патрэбныя кампетэнцыі для сучасных кадраў. Загадчыца кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права **Аксана Здрок** падкрэсліла актуальнасць новых метадык у падрыхтоўцы юрыстаў. Яна адзначыла запатрабаванасць у сучасным праве спецыялістаў новай фармацыі, якія ўмеюць вырашаць спрэчкі ў дасудовым парадку, пераконваць, весці перамовы, здольныя зменшыць колькасць праваых разглядаў. Для падрыхтоўкі такога выпускніка неабходна крэатыўнае навучанне, інавацыі і карэкціроўка зместу навучальных праграм.

Агучаныя ідэі падтрымаў расійскі госць. **Руслан Бозіеў** адзначыў, што любая ВНУ можа быць канкурэнтаздольнай і запатрабаванай толькі пры ўмове крэатыўнай і эўрыстычнай адукацыі. Менавіта гэты фармат падрыхтоўкі прымушае студэнтаў думаць, вучыць быць творцамі сваіх ведаў, а ў перспектыве – стваральнікамі будучыні. Па меркаванні галоўнага рэдактара часопіса «Педагогіка», сёння класічнаму ўніверсітэту трэба займаць ключавую пазіцыю ў аналізе недахопаў у ведах абітурыентаў, выяўленні і фіксаванні гэтых прабелаў. «Аналіз павінен стаць прадметам супрацоўніцтва ўніверсітэтаў з інстытутамі развіцця адукацыі, якім неабходна ўносіць змены ў праграмы па падрыхтоўцы настаўнікаў», – рэзюмаваў Руслан Бозіеў.

Матэрыялы круглага стала будуць апублікаваны на старонках часопіса «Педагогіка».

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

# Праграмы двух дыпломаў:

## БДУ пашырае супрацоўніцтва з Універсітэтам прыкладных навук г. Мітвайда (Германія)

Актыўнае ўзаемадзеянне двух універсітэтаў у галіне падрыхтоўкі на другой ступені адукацыі вядзецца з 2013 года, а летась два дыпломы – нямецкі і беларускі – атрымалі першыя выпускнікі сумеснай магістратуры «Кіраванне ў рэальным сектары эканомікі». У красавіку дэлегацыя БДУ наведала Германію і падпісала дадатковую дамову да дзейнай. Распавядаем пра вынікі плённага супрацоўніцтва і планы.



### Сумесная магістарская праграма

Універсітэт прыкладных навук Мітвайда і БДУ рэалізуюць некалькі сумесных праграм. Вылучаецца з іх англамоўная двухгадовая магістарская праграма «Кіраванне ў рэальным сектары эканомікі», першы выпуск якой адбыўся летась: дзевяць магістраў атрымалі двайныя дыпломы.

– Выпускнікі запатрабаваны на рынку працы, – адзначае куратар праграмы старшы выкладчык кафедры міжнароднага менеджменту эканамфака БДУ **Крысціна Шастакова**. – Першыя магістры гэтай праграмы часткова працаўладкаваліся ў Германіі, у кампаніях IBM, Volkswagen, Airbus. У Беларусі яны працуюць у ААТ «Белшына», кансалтынгавай кампаніі «Тут і цяпер» і інш. Прадстаўнікі ГК «Алютэх», дарэчы, ужо другі год запар будуць прысутнічаць на абароне магістарскіх прац – гэта дэманструе зацікаўленасць у спецыялістах, якіх мы рыхтуем на дадзенай праграме.

Падчас нядаўняга візіту дэлегацыі БДУ, у склад якой уваходзілі прарэктар па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях **Вольга Чупрыс** і дэкан эканамічнага факультэта **Ганна Каралёва**, да дзейнай дамовы была падпісана дадатковая. Дакумент прадугледжвае рэгулярнае чытанне лекцый выкладчыкамі БДУ ва Універсітэце прыкладных навук у рамках сумеснай магістарскай праграмы «Кіраванне ў рэальным сектары эканомікі».

– На працягу двух гадоў рэалізацыі праграмы ў забеспячэнні навучальнага працэсу ва Універсітэце прыкладных навук г. Мітвайда былі задзейнічаны асобныя выкладчыкі эканамічнага факультэта БДУ. Падпісаная дамова дазволіць павялічыць акадэмічную мабільнасць нашых выкладчыкаў і пашырыць пералік тых дысцыплін, якія яны будуць выкладаць у нямецкім універсітэце, – тлумачыць Ганна Каралёва.

Адзначым, што праграма візіту дэлегацыі БДУ ўключала таксама абмеркаванне магчымасцяў арганізацыі сумесных адукацыйных праграм па кірунку «Прыкладная матэматыка».

### Распрацоўка міждысцыплінарных праграм

Таксама падчас візіту нямецкі бок распавёў пра стварэнне міждысцыплінарнага інстытута, дзе сёлета адкрыюцца праграмы «Глабальная камунікацыя і бізнес-культура» і «Блокчэйн». Прарэктар Вольга Чупрыс адзначыла важнасць прымянення дадзенага досведу ў БДУ пры распрацоўцы міждысцыплінарных праграм.

Дарэчы, ужо ў наступным навучальным годзе ў БДУ запрацуе ***першая міждысцыплінарная магістарская праграма «Кіраванне медыяпраектамі»*** – вынік супрацоўніцтва эканамічнага факультэта і факультэта журналістыкі.

– Людзі, якія кіруюць рэдакцыямі, вельмі часта або журналісты-практыкі, якія да таго, як стаць кіраўнікамі, займаліся творчай дзейнасцю, або прыйшлі з іншай галіны, гэта значыць маюць практыку менеджменту ў іншай сферы і не ведаюць спецыфікі медыя, – распавядае **Андрэй Патрэбін**, дацэнт кафедры медыялогіі, куратар праграм магістратуры па спецыяльнасці «Журналістыка» факультэта журналістыкі. – Чакаецца, што дадзеная магістарская праграма будзе запатрабавана і ў замежных студэнтаў, таму што, напрыклад, у Кітаі медыяіндустрыя расце вельмі хуткімі тэмпамі і адчувае недахоп тых, хто ў стане кіраваць СМІ.

Для паступлення ў магістратуру па міждысцыплінарнай праграме неабходна будзе здаць іспыт па прадмеце «Менеджмент», а тым, хто не мае профільнай эканамічнай адукацыі, – дадатковы іспыт па прадмеце «Асновы менеджменту». Навучанне будзе весціся на рускай мове на працягу аднаго года. У навучальны план уключаны дысцыпліны, у якіх кампетэнтны кожны з факультэтаў. Прадметы «Праектнае кіраванне», «Стратэгічны менеджмент», «Інвестыцыйны менеджмент», «Макраэканамічны і мікраэканамічны аналіз» будуць выкладаць на эканамфаку, а «Кіраванне мультымедыйнай рэдакцыяй», «Асновы сучаснай журналістыкі», «Лічбавая трансфармацыя СМІ», «Крэатыўная індустрыя СМІ» – на журфаку.

У перспектыве, як адзначае Ганна Каралёва, дадзеная міждысцыплінарная магістарская праграма вырасце ў сумесную з Універсітэтам прыкладных навук Мітвайда падрыхтоўку журналісцкіх кадраў з выдачай двух дыпломаў. У працы будуць задзейнічаны адразу чатыры факультэты: эканамфак і журфак БДУ, а таксама факультэт журналістыкі і факультэт прамысловай інжынерыі нямецкага ўніверсітэта.

**Валерыя БАНДАРЧЫК**

# Новы трыумф газеты БДУ

**Газета «Універсітэт» стала пераможцам XV Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі». У нашага выдання гэта ўжо другая такая прэстыжная ўзнагарода, што сведчыць пра аўтарытэт газеты БДУ ў прафесійнай журналісцкай супольнасці.**



На ўрачыстым узнагароджанні 3 мая ў Dipservice Hall перад прадстаўнікамі вядучых рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ выступілі міністр інфармацыі Беларусі **Аляксандр Карлюкевіч** і намеснік Старшыні Савета Рэспублікі **Марыяна Шчоткіна**. Дыплом пераможцы і прэстыжную статуэтку рэдактару газеты «Універсітэт» **Сяргею ШАФАЛОВІЧУ** ўручыў першы намеснік старшыні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі **Сяргей ЧЫЖЫК** (на фота).

Універсітэцкае выданне было вылучана журы больш чым з 20 СМІ, якія прэтэндавалі на перамогу ў дадзенай намінацыі. Лаўрэатамі абвешчаны газета «Рэспубліка» выдавецкага дома «Беларусь сёння» і газета «Інтэграл» аднайменнага прадпрыемства.

У 2018 годзе на старонках газеты БДУ выйшла звыш 30 матэрыялаў навукова-папулярнай тэматыкі. Гэта аб'ёмныя публікацыі на тэму Дня беларускай навукі, матывацыі маладых навукоўцаў, распрацоўкі і запуску ўніверсітэцкага нанаспадарожніка, наведвання БДУ замежнымі касманаўтамі і астранаўтамі, магчымасцяў інавацыйных лабараторый, напісання артыкулаў у аўтарытэтныя міжнародныя часопісы, дасягненняў навуковых школ БДУ і шматлікія іншыя.

За апошні час газета «Універсітэт» перайшла на новы фармат, палепшыла паліграфію і змястоўныя кампанент, увяла актуальныя рубрыкі, стала выкарыстоўваць інфаграфіку, запусціла некалькі спецпраектаў. Вядзецца праца па прасоўванні выдання ў вэб-прасторы і папулярызацыі ў маладзевым асяроддзі. Многія публікацыі дзякуючы тэхналогіям дапоўненай рэальнасці маюць мультымедыйны характар.

***Газета «Універсітэт»*** *– адно з найстарэйшых перыядычных выданняў Беларусі. Яшчэ ў 1929 г. убачыў свет першы нумар агульнаўніверсітэцкай газеты «Ленінскім шляхам». З 1955 г. да 2006 г. яна называлася «Беларускі ўніверсітэт».*

Сёлета газета БДУ адзначае 90 гадоў з дня выхаду першага нумара. На старонках выдання знайшла адлюстраванне ўся шматгадовая гісторыя БДУ. Многія прызнаныя «акулы пяра» атрымалі тут свае прафесійнае станаўленне.

У маі 2009 г. «Універсітэт» стаў пераможцам V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета». Акрамя таго, газета БДУ станавілася лаўрэатам VI адкрытага фестывалю прэсы ва Украіне, а таксама міжнароднага конкурсу ў Казані (РФ) у намінацыі «Найлепшая ўніверсітэцкая газета». У 2016 г. «Універсітэт» узнагароджаны ганаровай граматай Міністэрства інфармацыі Беларусі.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
Фота Таццяны БАГАМАЗАВАЙ

# Абноўлена Дошка гонару

Такой пашаны яны ўдастоены за заслугі і дасягненні ў адукацыйнай, навуковай, метадычнай, інавацыйнай, кіраўнічай і спартыўнай дзейнасці па выніках 2018 года.

Свае віншаванні лаўрэатам адрасаваў рэктар БДУ **Андрэй Кароль**. Ён нагадаў пра дату, да якой прымеркавана цырымонія абнаўлення Дошкі гонару. Для гісторыі БДУ 15 мая стаў параломным. У гэты дзень 1943 года было прынята рашэнне Савета Народных Камісараў СССР пра аднаўленне працы ўніверсітэта ў мястэчку Сходня, недалёка ад Масквы. Рэктар падзякаваў студэнтам і супрацоўнікам за іх дасягненні і мэтанакіраваную дзейнасць па ўслаўленні ўніверсітэта.

Ад імя супрацоўнікаў выступілі загадчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай ФМА **Сяргей Лебядзінскі** і прафесар кафедры тэорыі функцыі ММФ **Наталля Броўка**. Сведчаннем пашаны і ўважлівага стаўлення да цэлага калектыву БДУ з'яўляецца, як адзначыла Наталля Броўка, штогадовае абнаўленне Дошкі гонару.

Трэцякурсніца эканамічнага факультэта **Юлія Атрошчанка** ў падзячным слове назвала БДУ «каштоўнай школай жыцця», дзе праз зацятасць, імкненне, намаганні і пры падтрымцы выкладчыкаў ёсць усе шансы цалкам рэалізаваць свой патэнцыял.

Адзначым, з ліку супрацоўнікаў на Дошку гонару занесены: электразваршчык пятага разраду ГГУ **Уладзімір Арцюшэўскі,** загадчык кафедры сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта **Зінаіда Бадзевіч,** намеснік дэкана факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі **Міхаіл Брылеўскі,** прафесар кафедры тэорыі функцый ММФ **Наталля Броўка,** вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі хіміі кандэнсаваных асяроддзяў НДІ ФХП **Сяргей Вайцяховіч,** дацэнт кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі факультэта журналістыкі **Аляксандр Градзюшка,** дацэнт кафедры клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін біялагічнага факультэта **Тацццяна Дзітчанка,** загадчык НДЛ прыкладнога імавернаснага аналізу кафедры тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі ФПМІ **Аляксандр Дудзін,** намеснік дырэктара па навуковай працы НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі **Юрый Дудчык,** дацэнт кафедры сацыяльнай камунікацыі ФФСН **Наталля Елсукова,** загадчык кафедры імуналогіі і экалагічнай эпідэміялогіі МДЭІ імя А. Д. Сахарава **Марына Зафранская,** прыбіральшчыцы памяшканняў студэнцкага гарадка **Тацццяна Казакевіч** і **Святлана Шанчук,** апаратчык у вытворчасці каштоўных металаў пятага разраду «Унікаштмет» БДУ **Святлана Карповіч,** намеснік дэкана факультэта «Вышэйшая школа бізнесу» ІБ **Іна Кісельнікава,** настаўнік інфарматыкі Ліцэя БДУ **Анжаліка Лапо,** загадчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай ФМА **Сяргей Лебядзінскі,** намеснік дырэктара па агульных пытаннях «Унітэхпрам» **Уладзімір Ломскі,** прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай працы Інстытута тэалогіі імя св. Мяфодзія і Кірыла **Міхаіл Мазур,** дэкан ФДА **Вячаслаў Малафееў,** старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту **Васіль Амялюсік,** загадчык кафедры камп'ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі ФСК **Алеся Праharэнка,** вядучы спецыяліст цэнтра навучальна-метадычнай працы РІКК **Маргарыта Рак,** намеснік начальніка ўпраўлення па справах культуры **Андрэй Рында,** загадчык кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян гістарычнага факультэта **Анатоль Салькоў,** загадчык аддзялення на аснове агульнай базавай адукацыі Юрыдычнага каледжа **Вадзім Самсонік,** начальнік кафедры процівапаветранай абароны ваеннага факультэта **Аляксандр Сівец,** загадчык кафедры сістэмнага аналізу і камп'ютарнага мадэлявання ФРКТ **Віктар Скакун,** прафесар кафедры тэарэтычнай фізікі і астрафізікі фізічнага факультэта **Ілья Феранчук,** старшы выкладчык кафедры неарганічнай хіміі хімічнага факультэта **Жанна Цабкала,** загадчык кафедры дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта **Тацццяна Чарвякова,** начальнік аддзела сацыяльнай працы ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю **Алена Шчатко.**

Сярод навучэнцаў на Дошку гонару занесены: чацвёртакурснікі ММФ **Яўген Аўдзейчык** і **Раўшан Атаеў,** трэцякурсніца эканамічнага факультэта **Юлія Атрошчанка,** чацвёртакурснік юрыдычнага факультэта **Мікіта Бялько,** трэцякурснік факультэта журналістыкі **Аляксандр Дабранаў,** чацвёртакурсніца філалагічнага факультэта **Марыя Жмайлік,** адзінаццацікласнікі Ліцэя БДУ **Уладзіслаў Зверык** і **Алег Караткоў,** магістрант ФПМІ **Андрэй Ільін,** трэцякурснік ФМА **Багдан Іодчык,** магістрант фізічнага факультэта **Лізавета Каваленка,** аспірант фізічнага факультэта **Ягор Колесаў,** магістрант гістарычнага факультэта **Артур Кандраценка,** чацвёртакурсніца юрыдычнага факультэта **Хрысціна Кананович,** трэцякурснік Юрыдычнага каледжа **Уладзімір Курганаў,** чацвёртакурсніца ФМА **Алена Лаўрэнава,** чацвёртакурснік ФРКТ **Мікіта Нячаеў,** трэцякурснік гістарычнага факультэта **Аляксандр Паршанкоў,** трэцякурснік ФФСН **Ягор Падаляк,** пяцікурсніца біялагічнага факультэта **Марыя Ратнікава,** магістрант біялагічнага факультэта **Дана Сіроткіна,** аспірант МДЭІ імя А. Д. Сахарава **Ганна Скібінская,** чацвёртакурсніца факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі **Аляксандра Цацэркіна,** чацвёртакурснік ваеннага факультэта **Ілья Трусевіч,** магістрант хімічнага факультэта **Вольга Тугай,** чацвёртакурсніца ФСК **Марыя Чакун,** магістрант ФРКТ **Марына Чэпелева,** трэцякурсніца Інстытута тэалогіі імя св. Мяфодзія і Кірыла **Ганна Чырыкава,** пяцікурсніца хімічнага факультэта **Анастасія Шабан,** магістрант эканамічнага факультэта **Карына Шапавалава,** чацвёртакурсніца ФПМІ **Ганна Якубовіч,** трэцякурснік ІБ **Станіслаў Якутовіч.**

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**02 чэрвеня Паўлава Людміла Васільеўна,** прафесар кафедры міжнароднага права

**05 чэрвеня Кабо Генадзь Якаўлевіч,** прафесар кафедры фізічнай хіміі

**06 чэрвеня Хадасоўская Аліна Міхайлаўна,** дацэнт кафедры малекулярнай біялогіі

**21 чэрвеня Кепчык Наталля Уладзіміраўна,** дацэнт кафедры агульнай матэматыкі і інфарматыкі

**22 чэрвеня Краўчук Анжаліка Іванаўна,** дацэнт кафедры вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання

**27 чэрвеня Мінько Анатоль Антонавіч,** загадчык кафедры фізічнай оптыкі і прыкладной інфарматыкі

**29 чэрвеня Альшэўская Святлана Валер'еўна,** дацэнт кафедры экалогіі чалавека

**29 чэрвеня Градаў Юрый Міхайлавіч,** прафесар кафедры дызайну моды

## АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: літаратурна-мастацкай крытыкі; біямедыцынскай інфарматыкі;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ карпаратыўных фінансаў;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ камунікатыўнага дызайну.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне па рабоце з персаналам, тэл. 209-54-36.

## БДУ ў СМІ Беларусі

**Міжнародная навуковая канферэнцыя «Сахараўскія чытанні 2019 года: экалагічныя праблемы XXI стагоддзя» ў БДУ** – БелТА, «Мінск-Навіны» (20.05), ecopress.by (21.05), energobelarus.by (22.05).

**Прыкладанне для правядзення інтэрактыўных урокаў па фізіцы Vedex VR Edutainment распрацавалі студэнты ФПМІ БДУ** – БелТА, news.yandex.by, wuz.by (20.05), 1prof.by, ecopress.by (21.05).

**XIV Міжнародны форум студэнцкіх хароў «Папараць-кветка БДУ» прайшоў у БДУ** – БелТА, zviazda.by, soyuz.by, radiostalica.by, news.yandex.by, vitebsk.vitebsk-region.gov.by (10.05), «Мінск-Навіны» (16.05).

**Сертыфікацыйны цэнтр па французскай мове адкрыецца ў БДУ** – БелТА, interfax.by, belarus-online.by, news.21.by, wuz.by (14.05), АНТ, zviazda.by, liderfm.by, radiostalica.by, news.yandex.by, telegraf.by (15.05).

**БДУ распрацуе канцэпцыю Рэспубліканскага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя** – БелТА, zviazda.by, wuz.by (14.05), liderfm.by (15.05).

**Першы ўсебеларускі маладзевы конкурс стартапаў StartUp Heart прайшоў у БДУ** – goodstart.by, wuz.by (13.05), zviazda.by, press-club.by, edu.gov.by (14.05).

**Геаграфічны факультэт БДУ перайменаваны ў факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі** – БелТА, sb.by, zviazda.by, news.yandex.by, wuz.by (23.04).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
29 мая 2019 года, № 8 (2214)

# Па слядах продкаў.

## Што могуць расказаць нашы прозвішчы?

Расшыфроўка прозвішчаў нагадвае дэтэктыў – шукаеш ключ, які часта схаваны глыбока ў мінулым. Што цікавага яны могуць распавесці пра нашых продкаў: месца пражывання, род заняткаў, магчыма, нават характар? Тут патрэбны навуковы падыход. Такі зафіксаваны ва ўнікальнай для нашай краіны кнізе **Валянціны Лемцюговай** і **Ірыны ГАПОНЕНКІ** «Карані нашых прозвішчаў», якую выпусціў выдавецкі дом «Звязда».



### «Кніга не падобная да слоўніка, хутчэй нагадвае этымалагічныя нататкі»

Усё жыццё прафесар Лемцюгова даследавала сучасную беларускую мову, анамастыку. Мела больш за 300 навуковых прац, вялікая частка якіх прысвечана пытанням станаўлення і функцыянавання ўсходнеславянскай айканіміі. Яе справу працягнула дачка Ірына. Іх сумесная кніга «Карані нашых прозвішчаў» увасобіла частку гісторыі нашых уласных імёнаў.

Кніга не толькі для лінгвістаў, гісторыкаў, этнографаў, фалькларыстаў, але і для ўсіх тых, хто хоча даведацца пра паходжанне свайго прозвішча і цікавіцца гісторыяй свайго роду. Яна пачыналася з аўтарскай рубрыкі Валянціны Лемцюговай «Что в имени моем», якая з'явілася на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня» ў 2008 годзе. Напачатку меркавалася, што выйдзе некалькі артыкулаў з асноўнымі звесткамі па гісторыі беларускіх уласных імёнаў. Але адразу пасля першага артыкула пачаўся вал запытаў, у якіх чытачы прасілі патлумачыць паходжанне іх прозвішчаў. Аўдыторыя атрымалася вельмі стракатая, пытанні задавалі людзі рознага ўзросту (ад школьнікаў да пенсіянераў) і месца жыхарства (не толькі з Беларусі, але і Расіі, Літвы, Польшчы, нават Злучаных Штатаў Амерыкі).

– У выніку ўсталявалася цэлая чарга з жадаючых даведацца пра паходжанне сваіх прозвішчаў. Сёння я працягваю гэтую рубрыку і адказваю на пытанні 2016 года. Адпаведна з пачаткам рубрыкі пачала рыхтавацца і кніга. У яе ўвайшлі адказы з 2008 па 2012 гг., – тлумачыць Ірына Гапоненка.– Кніга створана, каб задаволіць чытацкую цікавасць і падвесці навуковую базу пад тлумачэнні, бо газетны фармат часта не дазваляе гэта зрабіць, напрыклад, уключыць усе неабходныя адсылкі да навуковых крыніц.

Кніга пабачыла свет у 2018 годзе. Больш за 660 старонак утрымліваюць у сабе тлумачэнні каля 5000 прозвішчаў. Натуральна, такая лічба – кропля ў моры. Але па сутнасці атрымліваецца, што высветлена паходжанне прозвішчаў жыхароў невялікага гарадка.

Асноўны змест кнігі «Карані нашых прозвішчаў» складаюць чытацкія пытанні і адказы на іх. Рэестравыя прозвішчы размяшчаюцца ў алфавітным парадку. Адказ на пытанне даецца на мове запыту (рускай або беларускай).

– Кніга не з'яўляецца слоўнікам у класічным разуменні, хутчэй яе можна ахарактарызаваць як зборнік этымалагічных нататак. Уключэнне ў кнігу пытанняў апраўдана тым, што ў іх прыводзяцца факты з радаводу носьбіта прозвішча, інфармацыя адносна яго нацыянальнасці, месца нараджэння і іншыя звесткі, якія садзейнічаюць больш дакладнаму вызначэнню сэнсу, закладзенага ў прозвішчах. Акрамя таго, пытанні дэманструюць, што беларусы не абыякавыя людзі, яны цікавяцца сваім радаводам, шукаюць карані, – кажа Ірына Алегаўна.

Запыты даюць цікавую інфармацыю пра тое, як людзі самастойна шукаюць этымалогію. Напрыклад, арыгінальны ход чытацкай думкі праявіўся ў такім пытанні: «Моя фамилия Ахрамович. Для себя пояснил, что «ахра» – краска, «мович» – язык. То есть красноречивый человек». А на самай справе, наяўнасць у складзе прозвішча суфікса -овіч з'яўляецца паказчыкам таго, што Наргук ідзе пра нашчадка. Ахрамовіч – нашчадак Ахрэма, а Ахрэм – размоўны варыянт царкоўнага імя Ефрем.

Многім хочацца верыць, што іх прозвішчы паходзяць з замежных моў або пацвярджаюць шляхецкае паходжанне свайго носьбіта. Ірына Алегаўна зачытвае: «Что лежит в основе фамилии Арабей? Насколько я знаю, мои предки были косвенно связаны с Востоком». Але насамрэч арабей – гэта дыялектная форма слова верабей. Ці яшчэ: «Хочется узнать происхождение редкой фамилии Мамзель. Мне кажется, она имеет французские корни». Але «Дыялектны слоўнік Брэстчыны» сведчыць, што мамзель – гэта «той, хто лепіць гаршкі», якія ў беларускай гаворцы называюць мамзелікі (невялікі гаршчок, дзе варылі кашу).

### «Складаецца ўражанне лёгкасці этымалагічных пошукаў, што правакуе пашырэнне аматарскага падыходу»

Ірына Алегаўна адзначае, што чытацкія запыты адкрываюць цэлы сусвет беларускай гісторыі. Перш чым знайсці адказ, і чытачам, і навукоўцам часта даводзілася сутыкацца з рознымі цяжкасцямі.

Як распавядае прафесар, ёсць дзве групы прозвішчаў: прозвішчы, утвораныя ад імёнаў і мянушак. Прычым у аснову прозвішча могуць быць пакладзены імёны не толькі ў поўных афіцыйных формах, але і ў разнастайных размоўных, якія не любы носьбіт мовы звяжа з зыходным кананічным імем. Напрыклад, імя Аляксандр ужываецца ў размоўных варыянтах Аша, Ешура, Лёса, Лехан, Юка, Яка, Ліча, Лікса, Шанай, Шантыр, Шуля, Шуранда, Шуршак, Шуся і інш.

– Часам імёны і мянушкі супадаюць са словамі агульнымі. Глядзім, напрыклад, прозвішча Брошка – яно ўтворана ад формы імёнаў Абросім ці Браніслаў; Вінцік ад Віктар; Ёжык ад Георгій або Сяргей; Кіт ад Мікіта або Ціт; Мартышка ад Марцін. Узгадаем Францыска Скарыну. Часта паходжанне яго прозвішча звязваюць са скарынкай хлеба, але больш верагодна, што гэта форма хрысціянскага імя Скарыян, – працягвае Ірына Алегаўна.

На жаль, нават у друкаваных аўтарытэтных выданнях можна пабачыць памылковыя тлумачэнні. Напрыклад, прозвішча Нарчук тлумачыцца так: «Утворана ад слова нара. Жыў чалавек без хаты, у нары, або, як цяпер сказалі б, у зямлянцы. Вось і далі яму мянушку Нарчук, якую пазней запісалі прозвішчам». А насамрэч гэта форма імёнаў Наркіз або Апалінарый.

– У чым загана такіх фантазійных трактовак? Па-першае, яны змяшчаюць як мінімум недакладныя этымалагічныя звесткі і такім чынам выступаюць крыніцай дэзінфармацыі, па-другое, прозвішча – гэта народная і культурная спадчына. А паводле такіх аматарскіх тлумачэнняў нашы продкі выступаюць дзівакамі. Па-трэцяе, уяўная лёгкасць наіўных этымалогій дыскрэдытуе каштоўнасць навуковых метадаў даследавання мовы і зніжае прэстыж анамастычнай навукі. Працэс утварэння нашых прозвішчаў і назваў населеных пунктаў падаецца ў спрошчаным, а часам проста смехатворным выглядзе. У недасведчанага чалавека складваецца ўражанне, што прачытаць сэнс прозвішча зусім нескладана, і ён сам бярэцца за пяро.

У якасці ілюстрацыі таго, якія вынікі можа даць такая лінгвістычная ініцыятыва, глядзім вытрымку з сайта: «Акінча – продак прозвішча Акінча ў 18 % быў караім, у 15 % – украінец, у 15 % – іжорац, у 11 % – таджык, у 7 % – аманец, а ў 4 % адносіцца да заходнееўрапейскіх вытокаў, у 30 % выпадках з'яўляўся жыхаром Беларусі або Славеніі і Камеруна. Насіў прозвішча Akincha, а мянушка продка была Акінч».

– Таму кніга была спробай паказаць, што выяўленне паходжання прозвішчаў павінна праводзіцца на навуковай аснове. Зацікаўленасць людзей (і моладзі ў прыватнасці) моўна-анамастычнымі пытаннямі, безумоўна, трэба вітаць. Аднак добра было б, каб даследчыкі ў поўным аб'ёме ўсведамлялі складанасць задачы, за якую яны маюць намер узяцца, і сваю адказнасць за пададзеныя звесткі. Анамастычная лексіка нясе ў сабе вельмі важную інфармацыю пра нашу гісторыю, мову, культуру, і ставіцца да гэтай спадчыны трэба сур'ёзна. Анамастыка ўзнікла на стыку лінгвістыкі, гісторыі, этнаграфіі, тэалогіі, міфалогіі. Так што для этымалагічных даследаванняў такога кшталту патрабуюцца веды, а яшчэ ўменне іх прымяніць.

### «Змест прозвішчаў можна лічыць археалагічным скарбам»

Падышлі да таямніц: ці можна даведацца, адкуль пайшоў род, па прозвішчы? Якія сакрэты тут можна знайсці? Ці ўплывае гэта на характар? Навукоўцы даюць такі адказ:

– Па прозвішчы цяжка сказаць, адкуль пайшоў род. Адзінае, што можа падказаць, гэта наяўнасць суфіксаў -цк- і -ск-, якія часцей за ўсё прывязаны да канкрэтнага населенага пункта. Напрыклад, першы носьбіт прозвішча Раманоўскі хутчэй за ўсё звязаны з населеным пунктам Раманавічы, Раманава і так далей. У аснове прозвішча Ляцкі магла быць назва населенага пункта Ляды або Ляхава, Ляхавічы... Але такіх месцаў хапае на нашай тэрыторыі. Канкрэтна ўказаць месца, адкуль пайшоў род, можна толькі ў сітуацыі, калі прозвішча на -скі, -цкі ўтворана ад адзінкавага геаграфічнага найменя. Напрыклад, асновай для прозвішча Квяткоўскі служыць назва Квяткоўцы, якая фіксуецца толькі ў Іўеўскім раёне Гродзенскай вобласці. Там і трэба шукаць свае карані носьбітам гэтага прозвішча.

Навукоўцы рабілі лінгвістычны аналіз, не архівы і не гістарычны. Крыніцы прозвішчных этымалогій – перш за ўсё дыялектныя слоўнікі, слоўнікі беларускай, польскай, літоўскай, латышскай, нямецкай моў. Іншамоўныя слоўнікі патрабуюцца таму, што адметнай рысай беларускага антрапанімікону ў частцы прозвішчаў з'яўляецца наяўнасць у ім вялікай колькасці элементаў, якія трывала прыжыліся ў беларускай антрапанімічнай прасторы, аднак узыходзяць да іншамоўных каранёў. Такая этымалагічная стракатасць можа быць патлумачана спецыфічнасцю тэрыторыі пражывання беларускага народа, дзе назіраецца ўзаемаўплыў і ўзаеманакладанне розных культурна-моўных традыцый, а таксама шэрагам гістарычных абставін, якія спрыялі актыўным беларуска-іншамоўным кантактам. Некаторыя з прозвішчаў падобнага тыпу адлюстроўваюць адпаведную нацыянальную прыналежнасць іх носьбітаў, а іншыя ўтвораны ад празванняў, якія атрымлівалі беларусы з прычыны інтэнсіўнага пранікнення ў пэўны перыяд запазычаней лексікі таго ці іншага паходжання.

– У беларусаў надзвычай стракаты прозвішчны ландшафт. Нельга адназначна сказаць, што такое беларускае прозвішча. Так, прозвішчы з фармантамі -ан, -ян, -анц, -янц (Аганесян, Галумянц) з упэўненасцю апазнаюцца як армянскія, з фармантам -у (Чаўшэску, Ілінэску) як румынскія, з фармантамі -швілі, -адзэ (Гапрындашвілі, Чаўчавадзэ) як грузінскія, з фармантамі -ас, -іс (Ванагас, Межэлайціс) як літоўскія, з фармантам -енка, -анка, -энка (Азаранка, Бандарэнка) як украінскія і інш. Тып жа беларускага прозвішча нельга абмежаваць пэўнымі акрэсленымі прыметамі. Беларускі прозвішчны ландшафт характарызуецца выключнай разнастайнасцю і аб'яднаўвае мноства найменняў, адрозных паводле складу словаўтваральных сродкаў. Гэтым беларуская прозвішчная сістэма вылучаецца на фоне іншых значна больш аднародных (монатыповых) антрапасістэм. Генетычна ўласна беларускімі з'яўляюцца толькі прозвішчы з суфіксамі -онак / -ёнак і -еня / -эня, – дадае прафесар.

Прамой сувязі паміж прозвішчам і характарам няма, ды і ўвогуле, выяўленне такой сувязі не з'яўляецца задачай лінгвістыкі. Справа ў тым, што прозвішча на сучасным этапе – гэта дэматываваная адзінка нават у выпадку, калі ў яго аснову пакладзена цалкам празрыстая па значэнні мянушка. Так, напрыклад, абсалютна неабавязкова, што носьбіт прозвішча Моўчан будзе маўклівым. А вось яго продак, які некалі займеў мянушку Моўчан, хутчэй за ўсё адпавядаў гэтай характарыстыцы.

Шкада, але ўніверсальнай формулы расшыфроўкі паходжання і значэння прозвішча няма. Кожнае прозвішча – новы шлях, там свой аповед. Куды звяртацца, калі хочаш расшыфраваць сваё прозвішча? Спецыяльнай установы на Беларусі не існуе, але ёсць адпаведная служба ў Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі, спецыялісты якой займаюцца найперш урэгуляваннем спрэчных пытанняў, датычных уласных імёнаў.

– Нашы прозвішчы – гэта найбагацейшы скарб народнай славатворчасці, важная частка нацыянальнай культурнай спадчыны, яна павінна быць сабрана, апісана і навукова апрацавана. У іх увасоблены шматвяковы жыццёвы вопыт папярэдніх пакаленняў беларусаў, арыгінальнае мысленне, асаблівасці веравызнання, мудрасць, прадстаўлена багатая палітра моўных сродкаў і іншае. Змест прозвішчаў можна параўноўваць з археалагічным скарбам. Раскрытыя імёны, як і адшуканыя ў зямлі прадметы даўніны, дазваляюць даведацца пра быт, культуру, узаемаадносіны людзей, густы і заняткі, надзеі. Нездарма гэта так цікава насельніцтву. Цалкам нармальнае жаданне – ведаць свае карані. Таксама важна для асобаснага і нацыянальнага ўсведамлення: я тут невыпадковы, вось мой род, і я галінка гэтага дрэва, – падсумоўвае Ірына Гапоненка.

**Гутарыла**
**Алена ЛЯЎШЭНЯ**

# 7 медалёў з Малайзіі

**Юныя фізікі, матэматыкі, інфарматыкі, эколагі, біёлагі з 26 краін прынялі ўдзел у XXVI міжнароднай канферэнцыі юных навукоўцаў (ICYS-2019), якая прайшла ў красавіку ў Куала-Лумпуры, Малайзія. Упершыню нашы 6 школьнікаў, якіх рыхтавалі ў БДУ, заваявалі 7 медалёў.**



*Злева направа: Л. Марковіч, В. Жылко, А. Суравежкін, І. Няфёдаў, Д. Скарабагаты, К. Макаранка, А. Пячонкін, Р. Роўба, Б. Задворны*

Праграма канферэнцыі складалася з даклада-прэзентацыі па ўсіх дысцыплінах, дзе школьнікі на працягу 15 хвілін мелі сур'ёзную дыскусію па сваёй тэматыцы з прадстаўнікамі прафесійнага журы. У яго склад уваходзілі выбітныя навукоўцы і практыкі, запрошаныя аргкамітэтам з універсітэтаў Еўропы, Азіі і Афрыкі.

На ICYS-2019 ад нашай краіны было прадстаўлена 6 дакладаў. Гэтыя працы абралі па выніках 23 Рэспубліканскага конкурсу работ даследчага характару (канферэнцыя) навучэнцаў, дзе БДУ быў асноўным арганізатарам навуковага і метадычнага суправаджэння.

У выніку напружанай двухдзённай барацьбы, якая праходзіла на англійскай мове, нашы ўдзельнікі паказалі наступныя вынікі:

Залаты медаль атрымаў **Раман Роўба** (СШ № 44 Гомеля, даклад па фізіцы «Даследаванне ўласцівасцяў кроплі прынца Руперта»);

Залаты медаль у **Аляксандра Пячонкіна** (гімназія № 71 Гомеля, даклад па матэматыцы «Пра колькасць кропак на крывой у коле вылікаў»);

Сярэбраны медаль у **Ільі Няфёдава** (гімназія № 1 Віцебска, даклад па фізіцы «Даследаванне свабоднай плыні і формаўтварэння сыпкіх целаў у гравітацыйным полі»);

Бронзавы медаль у **Кірыла Макаранкі** (Ліцэй БНТУ Мінск, даклад (суаўтар: **Ілья Зур**) па фізіцы «Прымяненне стрыжневых ультрагукавых хваляводаў для разбурэння ледзякоў»);

Бронзавы медаль у **Дзмітрыя Скарабагатага** (гімназія № 38 Мінска, даклад па біялогіі «Распрацоўка экабяспечных складаў на аснове біяпалімера хітазану для інкруставання насення»).

Акрамя таго, у намінацыі «За найлепшы стэндавы даклад» журы канферэнцыі ўручыла медалі і **Антону Суравежкіну** (гімназія № 29 Мінска, даклад па матэматыцы «Навакольнасныя мностывы графаў») і **Д. Скарабагатаму**.

Кіраўнікі каманды: намеснік дэкана ФПМІ і член журы ICYS у секцыі «Матэматыка» і ў секцыі «Інфарматыка» Барыс Задворны; дацэнт фізічнага факультэта і член журы ICYS у секцыі «Фізіка» Віталь Жылко; загадчык кафедры фізікі Ліцэя БДУ і віцэ-прэзідэнт міжнароднага арганізацыйнага камітэта канферэнцыі ICYS Леанід Марковіч.

Такім чынам, упершыню ў гісторыі ўдзелу Беларусі ў міжнароднай канферэнцыі нашым 6 школьнікам атрымалася заваяваць 7 медалёў. Гэта кажа як пра высокі ўзровень падрыхтоўкі дакладаў на Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі па адпаведных дысцыплінах, так і пра добрую працу кіраўнікоў школьнікаў, трэнераў каманды, якія сумленна робяць сваю справу. Радуе той факт, што даклады нашых школьнікаў па фізіцы, матэматыцы і біялогіі паспяхова канкуруюць на сусветнай арэне, а таксама задаюць планку для астатніх дзяцей. Прывезлі на радзіму медалі і новыя планы міжнароднага навуковага супрацоўніцтва з юнымі навукоўцамі іншых краін.

Адным з кіраўнікоў каманды быў **Барыс Задворны**, намеснік дэкана на ФПМІ па прафесійнай арыентацыі і дадатковай адукацыі. Таксама ён быў намеснікам сустаршыні аргкамітэта 23 Рэспубліканскага конкурсу работ даследчага характару, дзе праходзіў адбор на міжнародную канферэнцыю. Барыс Валянцінавіч адзначае:

– На падрыхтоўку сур'ёзных навуковых праектаў у навучэнцаў сыходзіць часам больш за паўгода, а то і болей. Калі казаць пра секцыі матэматыкаў, за якую я непасрэдна быў адказны, то Антон Суравежкін і Аляксандр Пячонкін пачалі даследаваць свае задачы ўжо летам і восенню. Праца вялася паэтапна: задачы разглядаліся ў снежні на турніры матэматыкаў, потым яны дакладвалі ў лютым на канферэнцыі. Нашы хлопцы пастаянна знаходзілі дадатковыя матэрыялы, разглядалі тэму з розных бакоў, параўноўвалі з наяўнымі вынікамі ў навуковых артыкулах і ў інтэрнэце. Акрамя гэтага, беларускія навучэнцы актыўна трэніраваліся, гутарылі з нашымі навукоўцамі-кансультантамі, падцягвалі ўзровень англійскай мовы. У БДУ арганізоўваецца шмат мерапрыемстваў такога характару, пачынаючы з рэспубліканскай навукова-даследчай летняй школы, якая праходзіць на базе САК «Брыганціна» пад патранажам Міністэрства адукацыі і БДУ.

Зараз пераможцы працягнуць працу над сваімі даследаваннямі ўжо ў рамках навучання ва ўніверсітэтах. Прычым шматгадовая статыстыка паказвае, што большасць з іх выбіраюць БДУ. Медалісты прадстаўлены для заахвочвання ў спецыяльны фонд Прэзідэнта РБ па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. А пасля прыняцця і зацвярджэння рашэнняў савета фонду будуць узнагароджаны нагрудным знакам спецыяльнага фонду і атрымаюць магчымасць паступаць без іспытаў ва ўніверсітэты краіны на спецыяльнасці, адпаведныя профілям сваёй секцыі.

**Алена ЛЯЎШЭНЯ**

# Стэндап ад маладых навукоўцаў фізфака. Як гэта было?

**Праект Science Slam прайшоў па ініцыятыве кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў. Асаблівасць мерапрыемства ў прымяненні інавацыйных педагагічных тэхналогій.**

У фармаце стэндапа маладыя навукоўцы дзяліліся дасягненнямі, а госці выбіралі найлепшага спікера. Падобны праект запушчаны ў розных кутках свету і зараз пачынае свой шлях у БДУ.

Мерапрыемства складалася з двух этапаў. На першым трэба было падрыхтаваць і прадставіць вуснае выступленне з выкарыстаннем інавацыйных тэхналогій на тэму «Нобелеўскія лаўрэаты ў галіне фізікі». У кожнага ўдзельніка першага этапу быў свой ментар (студэнт старэйшага курса, які ўжо меў досвед у розных праектах), які вёў падапечнага ад пачатку і да фіналу.

На другім этапе спікерам давалася больш складаная задача – прадставіць праект з галіны свайго даследавання. Студэнты выбіралі канкрэтную тэму ў залежнасці ад навуковых інтарэсаў, выканання лабараторных прац па дысцыплінах або сфарміраваных раней кірунках навуковых інтарэсаў у галіне фізікі.

А роля слухачоў і гасцей не зводзілася да пасіўнага ўдзелу, а прадугледжвала актыўную працу ў выглядзе выканання розных інтэрактыўных заданняў праз інтэрнэт-рэсурсы, мабільныя тэхналогіі, навучальныя платформы, QR-коды і іншае. Вынікі падводзіліся з дапамогай анлайн-галасавання, спікераў узнагародзілі дыпломамі і сертыфікатамі.

Па словах навуковага кіраўніка і арганізатара **Галіны Пусянковай**, старшага выкладчыка кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, ідэя правядзення праекта Science Slam на фізфаку ўзнікла ў выніку паспяховай рэалізацыі навуковай студэнцкай канферэнцыі The Nobel Prize Winners in Physics у 2018 годзе, якая прыцягнула ўвагу вялікай колькасці студэнтаў.

У правядзенні мерапрыемства значную ролю сыграў навуковы гурток фізічнага факультэта English Science Club, у якім займаюцца студэнты I і II ступені навучання, для якіх англійская мова стала неабходным інструментам у прафесійнай дзейнасці. Клуб дапамог аб'яднаць студэнтаў у арганізацыі мерапрыемстваў універсітэцкага і міжнароднага ўзроўню. Сярод іх такія праекты: The Nobel Prize Winners in Physics, Christmas Party, International Public Speaking Competition, Science Slam. Таксама клуб бярэ ўдзел у міжнародных і міжуніверсітэцкіх праектах: Three Minute Thesis Conference, міжуніверсітэцкі конкурс перакладчыкаў, першая зімовая школа па фізіцы і матэматыцы для кітайскіх студэнтаў Сумеснага інстытута Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта і БДУ. Вынікі ўдзелу ў дадзеных праектах – гэта дыпломы і сертыфікаты.

***Алена КАРПІЕВІЧ, метадыст навучальна-метадычнай лабараторыі інавацый у адукацыі:***

– Падобны фармат правядзення канферэнцый важны як для развіцця прамоўніцкага майстэрства, так і для павышэння прэстыжу кар'еры навукоўца сярод будучых выпускнікоў універсітэта. Эрудыцыя, камунікатыўныя ўменні, свабоднае валоданне замежнай мовай і інфармацыйнымі тэхналогіямі – гэта тое, што пазітыўна змяняе вобраз сучаснага даследчыка, робіць яго паспяховым і грамадска значным.

Поспех прымянення падобнага роду навукова-папулярных формаў, якія актыўна ўкараняюцца ў акадэмічнае асяроддзе, шмат у чым залежыць ад творчых удасканаленняў арганізатараў, у дадзеным выпадку кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў у асобе Галіны Пусянковай, якая прапанавала шэраг цікавых арганізацыйных і педагагічных рашэнняў. Напрыклад, прыцягненне да выступленняў на англійскай мове студэнтаў другога курса, якія пакуль не гатовыя прадстаўляць свае самастойныя даследчыя працы, але могуць займальна распавесці аўдыторыі пра нобелеўскіх лаўрэатаў па фізіцы. Увагі заслугоўваюць таксама шматлікія заданні і бліц-апытанні пасля кожнага этапу Science Slam, выкананне якіх ажыццяўлялася пасродкам Mentimeter і іншых анлайн-рэсурсаў і мабільных прыкладанняў. Пазнаёміцца з сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі выкладчыкі БДУ мелі магчымасць на семінарах-трэнінгах у рамках праекта «Эразмус+» «Змена ў адукацыйным асяроддзі: прасоўванне інавацыйнага выкладання і навучання ў краінах Усходняга партнёрства».

***Марыя ЦЕРАХАВА, магістрант:***

– Я ўражана арганізацыяй мерапрыемства. Спадабалася тое, што выступоўцу можна было ананімна анлайн задаць пытанне. Хацелася б мець такую ж зручную функцыю на іншых канферэнцыях. А для спікераў таксама была выдатная магчымасць паглядзець на мэту сваёй працы глабальна.

Science Slam прайшоў на Дзень фізіка. Таму, мерапрыемства змаглі наведаць і выпускнікі, азнаёміцца з тым, што цяпер адбываецца на факультэце. А студэнты малодшых курсаў змаглі даведацца больш пра даследаванні кафедраў.

Такія праекты граюць важную ролю ў станаўленні ідэнтыфікацыі студэнта як часткі БДУ, стварэння свайго роду «навуковай сям'і», да якой можна звярнуцца нават па заканчэнні ўніверсітэта.

**Аліна БАРТКЕВІЧ**

### Даведка

Science Slam – праект па папулярызацыі навукі, прыдуманы немцам Грэгарам Б'юнінгам у 2010 годзе. Гэта серыя лекцый, якія чытаюць маладыя навукоўцы. Кожнае выступленне доўжыцца абмежаваны час, як правіла, не больш за 10 хвілін. Выклад даследавання павінен быць зразумелым непадрыхтаванай аўдыторыі.

УНІВЕРСІТЭТ
29 мая 2019 года, № 8 (2214)




*Тэлемост з Дзяржаўным музеем-запаведнікам «Растоўскі крэмль» у рамках акцыі ЮНЕСКА, прысвечанай Сусветнаму дню культурнай разнастайнасці. 2018 год*

# Сацыяльная камунікацыя – мост у будучыню

20 гадоў назад у БДУ пачалася падрыхтоўка спецыялістаў сацыяльнай камунікацыі.

## Гісторыя спецыяльнасці

У выніку ўдзелу БДУ ў праекце «Тэмпус» сумесна з французскімі, англійскімі і іспанскімі ўніверсітэтамі ў 1997 г. на філасофска-эканамічным факультэце на кафедры сацыялогіі была адкрыта спецыяльнасць «Інфармацыя і камунікацыя».

У маі 1999 г. на новым факультэце філасофіі і сацыяльных навук утворана асобная кафедра сацыяльнай камунікацыі, якую ўзначаліла В. В. Цярэшчанка.

Распрацоўка навучальнага плана новай спецыяльнасці вялася з арыенцірам на створаныя ў постсавецкіх краінах першыя рэкламныя і маркетынгавыя агенцтвы. Былі абраны такія кірункі, як маркетынгавыя камунікацыі, маркетынгавыя даследаванні, а таксама медыйныя даследаванні і вымярэнні (медыяметрыя). У распрацоўцы навучальных дысцыплін браў удзел прафесар А. А. Крыштаноўскі – першы дэкан факультэта сацыялогіі Вышэйшай школы эканомікі (Масква). Перспектыўнасць медыяметрыі знайшла сваё пацвярджэнне на сустрэчы ў Прэзідэнта Беларусі 31 студзеня 2019 г., калі абмяркоўвалася неабходнасць стварэння спецыяльнай арганізацыі, якая будзе ацэньваць рэйтынгі беларускіх сродкаў масавай інфармацыі.

Падрыхтоўка студэнтаў па спецыяльнасці «інфармацыя і камунікацыя» апынулася настолькі ўніверсальнай, што ўжо напачатку 2000-х гг. іх пачалі запрашаць на працу не толькі даследчыя агенцтвы, але таксама замежныя арганізацыі, якія працуюць у Беларусі і надаюць вялікае значэнне як прасоўванню сваіх тавараў і паслуг, так і эфектыўнасці ўнутрыарганізацыйнай камунікацыі. Таму ў 2002 г. былі адкрыты дзве спецыялізацыі: *«інфармацыя і камунікацыя ў арганізацыі»* і *«інфармацыя і камунікацыя ў сістэмах масавых паводзін»*. Арганізацыйныя камунікацыі ўключалі знешнія і ўнутраныя камунікацыі арганізацыі, ІКТ у арганізацыі і арганізацыйны кансалтынг, а масавыя камунікацыі – рэкламу, сувязі з грамадскасцю, маркетынгавыя і медыйныя даследаванні. Гэта дазволіла рыхтаваць спецыялістаў шырокага профілю, што павышала іх магчымасці на рынку працы, пры гэтым «майстроў на ўсе рукі», якія забяспечваюць поўны спектр камунікацыйных запатрабаванняў сярэдняга і малога бізнесу.

У 2011–2012 гг. быў праведзены другі рэбрэндынг спецыяльнасці, якая атрымала новую назву «сацыяльныя камунікацыі». Ён заключаўся таксама ў з'яўленні двух новых кірункаў: уласна «сацыяльныя камунікацыі» (інфармацыйныя і камунікацыйныя тэхналогіі ў некамерцыйным сектары – дзяржаўных органах; арганізацыях адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнай абароны, культуры; а таксама ў грамадскіх арганізацыях) і «арганізацыйныя інтэрнэт-камунікацыі», якія ўключалі вэб-дызайн (кантэнт, юзабіліці, колеракампазіцыя, праграмаванне), новыя медыя, інтэрнэт-маркетынг.

З 2002 г. кафедра сацыяльнай камунікацыі рэгулярна праводзіць буйную міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Камунікацыя ў сацыяльна-гуманітарных ведах, эканоміцы, адукацыі» і шматлікія іншыя навуковыя мерапрыемствы. Праект «Майстэрня сацыякама» дае студэнтам і ўсім ахвотнікам магчымасць сустрэцца з вядучымі спецыялістамі ў сферы камунікацыі, як беларускімі, так і замежнымі. Кафедрай выдадзены шэраг новых навучальных дапаможнікаў і зборнікаў навуковых прац, якія не маюць аналагаў на рускай мове.

## Інавацыйны складнік

Кафедра сацыяльнай камунікацыі з'яўляецца ўнікальным інавацыйным структурным падраздзяленнем ФФСН БДУ. Яе выпускнікі працуюць у сферы рэкламнай камунікацыі і піяр-агенцтвах, у НДІ і цэнтрах сацыялагічных і палітычных даследаванняў, у кансалтынгавых і маркетынгавых арганізацыях, на буйных прадпрыемствах і ў арганізацыях малога і сярэдняга бізнесу.

Ажыццяўляецца шматпрофільная падрыхтоўка спецыялістаў па найважнейшых кірунках развіцця рынку, што прыцягвае абітурыентаў. Штогод фіксуецца высокі прахадны бал пры паступленні на спецыяльнасць, на бюджэтнай і пазабюджэтнай аснове, і запатрабаванасць выпускнікоў на рынку працы.

Высокі ўзровень практыка-арыентаванасці ў падрыхтоўцы кадраў па сацыяльнай камунікацыі забяспечваецца за кошт узаемадзеяння на пастаяннай аснове з базамі практык, да прыкладу, з Міжнародным агенцтвам сацыялагічных і маркетынгавых даследаванняў. МАСМД выступае філіялам кафедры і садзейнічае навучанню даследаванням у галіне маркетынгу і рэкламы.

## Сацыяльная рэклама – дзяржаўная задача

Падрыхтоўка спецыялістаў па сацыяльнай камунікацыі вядзецца ў адпаведнасці з запатрабаваннямі розных мэтавых груп і адлюстроўвае дзяржаўныя інтарэсы – сацыяльную бяспеку грамадзян, іх абароненасць, захаванне здароўя, прафілактыку асацыяльных з'яў і інш.

Інавацыйнай тэхналогіяй, выкладанне якой укаранёна на кафедры, з'яўляецца рэклама. Не толькі камерцыйная, палітычная, але і сацыяльная рэклама сёння фарміруе новыя падыходы да рашэння складаных сацыяльных праблем, у чым зацікаўлены дзяржаўныя структуры.

У самым шырокім значэнні сацыяльная рэклама – гэта рэклама, якая служыць для змены стэрэатыпаў, якія склаліся ў грамадстве і з прычыны сваіх асаблівасцяў уплываюць на светапоглядныя пазіцыі перш за ўсё моладзі. Сацыяльная рэклама як від масавай камунікацыі арыентавана на прыцягненне ўвагі да надзённых праблем грамадства. А з іншага боку, сацыяльнае пасланне заўсёды мае канкрэтнага спажыўца, г. зн. сваю мэтавую групу.

Да дзяржаўных арганізацый, якія выступаюць рэкламадаўцамі, адносяцца Міністэрства адукацыі, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства па падатках і зборах і інш. Спецыфіка сацыяльнай рэкламы заключаецца ў тым, што гэтыя дзяржорганы прасоўваюць сацыяльна значныя інтарэсы розных груп насельніцтва, у той жа час фарміруюць станоўчы вобраз дзяржаўных устаноў.

Яшчэ ў 1998 г. пры Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь створаны міжведамасны савет па рэкламе, у 2013 г. яго функцыі былі пашыраны. У рамках дзейнасці савета вылучана група спецыялістаў па сацыяльнай рэкламе, якія прадстаўляюць інтарэсы розных дзяржаўных ведамстваў і структур.

На пасяджэннях савета, пры ўдзеле прадстаўнікоў кафедры, абмяркоўваюцца новыя рэкламныя праекты, зацвярджаюцца тыя з іх, якія адпавядаюць нарматыўна-прававой базе заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб рэкламнай дзейнасці і адпавядаюць высокаму мастацкаму ўзроўню, прымаюцца рашэнні пра іх размяшчэнне.

## Найбліжэйшыя перспектывы

Плануецца пашыраць працу па прафарыентацыі студэнтаў з акцэнтам на даследчую працу, адкрыць студэнцкую лабараторыю. Дзейнасць СНДЛ будзе спрыяць развіццю навыкаў у правядзенні навуковых даследаванняў, сацыяльных праектаў і інавацый, запатрабаваных рознымі мэтавымі групамі.

На кафедры склаліся спрыяльныя ўмовы для развіцця спецыяльнасці на ўсіх узроўнях вышэйшай адукацыі, уключаючы першую і другую ступені і аспірантуру. У наш час адкрыты магістарскія праграмы: «Камунікатыўны менеджмент (менеджар па камунікацыі)»; «Камунікатыўны менеджмент (для замежных студэнтаў)», «Медыякамунікацыі (спецыяліст па камунікацыях у інтэрнэце)». У 2019 годзе плануецца набор у магістратуру па спецыяльнасці «камунікацыі» (прафілізацыя «медыядаследаванні і сацыяльная аналітыка») і Communication (Social Communication Research) – для замежных студэнтаў на англійскай мове. Асаблівасцямі падрыхтоўкі спецыялістаў з'яўляюцца скіраванасць на атрыманне як фундаментальнай падрыхтоўкі ў галіне сацыяльнай аналітыкі, так і навыкаў медыядаследаванняў і іншамоўнай прафесійнай камунікацыі.

У планах кафедры – адкрыццё аспірантуры па спецыяльнасцях 22.00.04 – сацыяльная структура, сацыяльныя інстытуты і працэсы (сацыялагічныя навукі); 22.00.06 – сацыялогія культуры (сацыялагічныя навукі).

**Загадчыцы кафедры:**
**В. В. ЦЯРЭШЧАНКА (1999–2016),**
**Я. С. ЯСКЕВІЧ (2017–2018),**
**І. І. КАЛАЧОВА (з 2019)**

## Слова выпускнікам

Менавіта сацыякам стаў асновай для абароны дысертацыі, адкрыцця ўласнай кампаніі і росту ў прафесіі. Дзякуй вам!

**Надзея БОБАВА,**
**PhD, CEO, KMB Lab**

Дзякую за ўсё: і за магчымасць вучыцца ў сапраўды найлепшых у сваёй справе, і за набраны сацыяльны капітал, і за студэнтаў, якіх я з задавальненнем наймаю ўжо як працадаўца. Доўгіх гадоў жыцця!

**Ганна ЗАЯЦ,**
**начальнік аддзела B2B маркетынгу Беларускага партала TUT.BY**

Аддзяленне сацыяльнай камунікацыі – гэта сапраўдная вялікая сям'я, пачынаючы ад студэнтаў і выпускнікоў і заканчваючы выкладчыкамі. Тут можна сустрэць людзей, якім не ўсё адно і якія выразна разумеюць, навошта яны тут. Жадаю не згубіць гэту якасць у будучыні!

**Ілья АНТАНОВІЧ,**
**выпуск 2011. Senior Account Manager у digital-агенцтве Fistashki / co-founder digital-агенцтва Tribe**

Дзякуй выкладчыкам, што дзяліліся ведамі, фарміравалі практычны інтэлект і шырыню думкі. Жадаю кафедры новых напрамкаў, таленавітых і руплівых студэнтаў і паспяховых выпускнікоў!

**Вікторыя КОТАВА,**
**выпуск 2016, кіраўнік аддзела медыяпланавання ў digital-агенцтве**

Віншую кафедру з юбілеем! Ніколі не думаў, што аднойчы буду выкладаць сацыяльныя эфекты ўздзеяння СМІ для амерыканскіх студэнтаў, бо падчас маёй вучобы я не асабліва цікавіўся гэтай тэмай. Але, нягледзячы на гэта, веды, якія я атрымаў падчас навучання, аказалася дастаткова, каб не разгубіцца ў Штатах падчас навучання ў grad school. Жадаю кафедры сацыяльнай камунікацыі БДУ далейшага развіцця, а таксама разумных і мэтанакіраваных студэнтаў, якія потым канвертуюцца ў паспяховых выпускнікоў!

**Антон ДЗІНЕРШТЭЙН,**
**PhD candidate, ABD, Department of Communication, University of Massachusetts Amherst**

Вышэйшая адукацыя заклікана сфарміраваць не толькі спецыяліста, але і асобу. Замежны студэнт Раміль Гусейнаў з Азербайджана пераканаўча гэта даказвае.
Пра тое, як навучанне ў БДУ дапамагло сфарміраваць яго асабістую філасофію, пра спецыфіку працы спецыяліста па міжнародных адносінах даведалася газета «Універсітэт».

# «Паміж намі значна больш агульнага»

## Раміль Гусейнаў з Азербайджана



### Візітоўка

- Раміль, як і іншыя героі спецпраекта, адзначае, што на першым годзе жыцця ў Беларусі самая важная падтрымка – ад бацькоў.
- У Раміля былі цяжкасці ў пачатку вучобы, але ён іх пераадолеў, калі змяніў сваё стаўленне да заняткаў.
- Толькі тут ён навучыўся катацца на сноўбордзе.
- У азербайджанцаў студэнт адзначае такую рысу, як прадпрымальніцкую жылку, у беларусаў – працавітасць.





### Мала сонца і моўны бар'ер

Раміль Гусейнаў заканчвае 4 курс міжнародных адносін ФМА БДУ. Шлях у прафесію стаў няпростым, але ўсвядомленым – спецыяльнасць студэнт абраў па ўласным жаданні. Аднак гісторыя пачынаецца значна раней… 22 гады таму ў сталіцы Азербайджана сонечным Баку.

Аўтарытэт бацькоў у Азербайджане высокі! І, калі мама Раміля, ураджэнка Расіі, прапанавала паступіць у Беларусь, хлопец пагадзіўся. І ў Маскве ёсць шмат прэстыжных профільных універсітэтаў, як, напрыклад, МДІМА, але, па словах мамы, Беларусь вельмі спакойная і камфортная краіна, у якой нізкі ўзровень злачыннасці і добрыя людзі. У гэтым студэнт пераканаўся сам. Адзінае, чаго яму моцна бракуе, сонца. Пасля сонечнага Азербайджана пахмурнае надвор'е значна ўплывае на настрой, а калі прамяні зноў з'яўляюцца, то разам з імі прыходзіць радасць і энергія.

Моўны бар'ер таксама паспяхова пераадолены: прыехаўшы ў 17 гадоў і паступіўшы на факультэт даўніверсітэцкай адукацыі, Раміль не вельмі добра размаўляў па-руску. А вось беларускую мову Раміль лічыць цікавай, разумее яе, але не гаворыць на ёй – складана вымаўляць. «Я ведаю шмат людзей, якія, як калісьці і я, дрэнна размаўлялі па-руску, але ўзяліся за справу – і цяпер выступаюць з дакладамі. Мы прыехалі сюды вучыцца, таму не варта саромецца свайго моўнага ўзроўню», – кажа ён.

### Узяцца за розум

Скончыўшы падрыхтоўку, азербайджанец паступіў на міжнароднае права на юрыдычны факультэт. «Вучыўся я не вельмі добра, былі праблемы, але ўсё гэта вырашылася. Я перавёўся на міжнародныя адносіны ФМА, кожны семестр паляпшаў свае вынікі, у першым семестры былі чацвёркі-пяцёркі, цяпер у мяне выдатныя адзнакі і зніжка за навучанне». Паслея адзначылі, асабліва прыемна было пачуць пахвалу ад выкладчыцы Таццяны Афанасьевай, якая, як адзначае Раміль, займальна праводзіць пары і ўмее пажартаваць са студэнтамі.

«Я хачу параіць прыезджым навучэнцам слухаць сваіх бацькоў, не было такога, што яны сказалі мне штосьці няправільна. Вучыся, не прагульвай заняткі, не хадзі па клубах – здаецца, такія банальныя рэчы, але, калі прытрымлівацца гэтых парад, жыццё сапраўды наладжваецца», – раіць замежны студэнт.

На другім курсе Раміль Гусейнаў пачаў актыўна займацца грамадскай дзейнасцю, удзельнічаў у канферэнцыях і ўвайшоў у савет студэнцкай ініцыятывы на ФМА «Старт».

### А ці ёсць розніца?

Студэнт адзначае, што нашы ментальнасці не так моцна адрозніваюцца, як можа здацца. «Большасць тых, хто прыязджае, думаюць, што яны моцна адрозніваюцца, але насамрэч гэта не так. Мы ўсе калісьці жылі ў адной краіне, і гэта паўплывала на бацькоў і іх дзяцей – нас. Чым мы адрозніваемся ад беларусаў? Нічым. Ходзім на шпацыры, у кавярні з дзяўчатамі. У вас захавалася шмат прыкмет з савецкага часу, а ў нашай краіне ёсць вернікі, якія строга прытрымліваюцца рэлігійных традыцый, але такіх не шмат», – тлумачыць Раміль.

Навучанне на ФМА дае плён: малады чалавек выдатна разбіраецца ў геапалітыцы і кажа, што жаданне адмежавацца і падкрэсліць аўтэнтычнасць – неабходная ўмова для здабыцця незалежнасці.

Ёсць добрая азербайджанская прымаўка: у чалавека пяць пальцаў, і ўсе яны не аднолькавыя. Так і людзі: Раміль лічыць, што нельга меркаваць пра чалавека адназначна дрэнна. І, хоць сапраўды ў яго можа быць дрэнны бок, заўсёды ёсць і светлы. Тым больш гэты «дрэнны» можа быць відавочны толькі нам – сеў не так, апрануўся не так – зірнулі павярхоўна і злуемся.

### За гады навучання мы ўсе змяняемся

«На ФМА ніколі не было радыкальных поглядаў у гэтым пытанні. Я на 100% упэўнены, што калі б я не паступіў на гэты факультэт і не вучыўся б на гэтай спецыяльнасці, то не стаў бы тым, хто я ёсць цяпер. Выкладчыкі выдатныя: выкладаюць тыя, хто стварaў факультэт, удзельнікі палітычных дэбатаў, палітычнага жыцця, заўважныя спецыялісты на міжнароднай арэне».

Варожасці да замежнікаў, з якой ён сутыкаўся ў Маскве і ў Кіеве, па словах Раміля, у Мінску амаль не бачыў. Пачуў толькі пару непрыемных слоў, ды і то ад людзей з нізкім культурным узроўнем. Туркменаў, напрыклад, у Беларусь прыязджае шмат, і яны збіраюцца ў групы, а азербайджанцаў мала, таму яны актыўна далучаны ў зносіны з усімі. «Я лічу, што трэба з павагай і разуменнем ставіцца да прыезджых замежнікаў. Няпроста адаптавацца, асабліва калі гэта зусім невядомая краіна. За гады навучання мы ўсе змяняемся, і я, безумоўна, гэта адчуваю», – кажа ён.

### Прастора і Мінскае мора

На першым курсе з сябрам Раміль хадзіў у трэнажорку ў інтэрнаце, займаўся вольнай барацьбой. Узімку ў Лагойску і Сілічах навучыўся катацца на сноўбордзе. Ад універсітэта студэнт наведвае культурныя мерапрыемствы, асабліва ўразіў Музей Вялікай Айчыннай вайны. Мінск на фоне Баку, дзе вельмі шчыльная забудова і вузкія вулачкі, проста ўражвае абшарам. Улюбёнымі месцамі ён называе Мінскае мора, тэрыторыю санаторыя «Юнацтва».

### Яшчэ раз пра бацькоў

«У нас вельмі моцная сувязь з бацькамі, іх мы шануем і паважаем. Ёсць адказнасць за тое, што мы робім. А калі прыязджаеш у іншую краіну, дзе няма бацькоў, то ўзнікае жаданне «паспытаць» волі. Справа нават не ў тым, што Беларусь больш вольная, а ў тым, што няма бацькоў, і ёсць грошы, якія яны дасылаюць. Адпачываць, вядома, трэба, але пакрысе. Так адбылося са мной: я дрэнна вучыўся, больш праводзіў час з сябрамі. Але пасля сур'ёзнай гутаркі з бацькамі змяніўся. Зараз усім раю адразу брацца за розум: я паспрабаваў, і гэта адбілася на маёй паспяховасці – у выніку атрымаў зніжку на навучанне».

### Што матывуе вучыцца?

«У Мінску выпадкова сустрэў свайго аднакласніка, ён вучыўся на эканамічным факультэце, ужо адслужыў і працуе на радзіме. У нас ва ўніверсітэтах няма ваеннай кафедры, таму служба ў нас абавязковая. Армія добрая, ніхто асабліва не імкнецца «адкасіць». Я лічу, што служба ў войску можа спатрэбіцца ў жыцці», – кажа Раміль.

Азербайджан ужо 20 гадоў знаходзіцца ў стане вайны з Арменіяй, людзі аб'ядноўваюцца, і на першы план выходзяць інтарэсы дзяржавы. Аднак ваеннае становішча ў Баку не адчуваецца. Карабахскую праблему пераадолець не атрымалася дагэтуль, асноўная мэта азербайджанскай палітыкі – яе вырашыць. Гэта паўплывала на жаданне Раміля паступіць на ФМА. Пасля вучобы ён плануе вярнуцца ў Азербайджан і працаваць па спецыяльнасці, і, хто ведае, можа, яму атрымаецца зрабіць важкі ўнёсак у рашэнне канфлікту.

**Надзея МАРХЕЛЬ**

УНІВЕРСІТЭТ
29 мая 2019 года, № 8 (2214)



# Bright Fest:

## насустрач Еўрапейскім гульням



**Настрой моладзевага фэсту быў сугучны слогану Еўрапейскіх гульняў – Bright Year, Bright You. Студэнцкія ініцыятывы былі прадстаўлены 11 мая на пляцоўках Нацыянальнага алімпійскага стадыёна «Дынама» напярэдадні адкрыцця II Еўрапейскіх гульняў. Арганізатарамі шоу сталі БДУ, дырэкцыя спартыўнага свята 2019 года.**

Вакол стадыёна віравала больш за 50 забаўляльных зон. 8 тэматычных пляцовак пазнаёмілі гасцей (і абітурыентаў) з дзясяткамі праектаў і згуртаванняў нашага універсітэта. Сярод іх: «Фэст эстрады БДУ», «Тэатральны куфар», «Ты – на хвалі», «Сузор'е прыгажосці», «Нас аб'ядноў БДУ», «Ліга КВЗ БДУ», ансамбль танца «Літарынка», ансамбль «Тутэйшая шляхта» і інш.

Са сваімі візітоўкамі выступілі моладзевыя арганізацыі. Напрыклад, Студэнцкі саюз падрыхтаваў мальберт, дзе кожны мог напісаць ці намаляваць сваю асацыяцыю са студэнцтвам.

Натоўпы гледачоў збіраліся ля інтэрактыўнай пляцоўкі «Віртуозы эксперыменту». Хімікі, фізікі, географы, біёлагі зачароўвалі навукай. Вадкі азот, насякомыя і бактэрыі, колбы з растворамі, пароды, кветкі – віртуозы змаглі здзівіць усіх.

– Паказваем хімічныя доследы «Вулкан», «Святлафор» з афарбоўваннем раствору, «Хімічны парэз» са «штучнай крывёй» і іншыя. Мы гатовыя дарыць радасць гледачам і здзіўляць іх. Зразумела, выбар хімічных доследаў звязаны з маштабам і фарматам мерапрыемстваў. Ёсць доследы, якія патрабуюць старанннай падрыхтоўкі, іх так проста не пакажаш. А тут мы дэманструем простыя рэакцыі, – распавядае **Юлія Баярскіх,** студэнтка 3 курса хімфака. – Я кіраўнік праекта «Віртуозы хімічнага эксперыменту». Наш праект тлумачыць, як трэба паказваць доследы. Гэты карысны кірунак, забаўляльны і ў той жа час прафарыентацыйны, у яго добрая будучыня.

– Мы дэманструем доследы з вадкім азотам. Гэта маляўнічыя прадстаўленні. Паказваем, як пад уздзеяннем азоту шарык надзімаецца, а ружа становіцца крохкай, як тонкае шкло, – тлумачыць кіраўнік «віртуозаў фізікаў» **Павел Вараб'ёў,** студэнт 3 курса. – Праграма абкатаная, з ёй выступаем у розных гарадах, школах, прываблліваем дзяцей на фізфак. Кожны з нашай каманды паказвае «фішкі» з той галіны, дзе ён эксперт.

– Гэта калоніі бактэрый у кубку Петры. Пажыўнае асяроддзе выкладваюць у выглядзе малюнка, а бактэрыі, якія размнажваюцца, надаюць яму «афарбоўку». А ў мікраскопе можна паглядзець на рачка дафнію, які насяляе ўсе вадаёмы, – дае тлумачэнні **Ганна Шляга,** студэнтка 1 курса біяфака.

Прафкам БДУ падрыхтаваў для абітурыентаў інфармацыйны стэнд пра навучанне ва ўніверсітэце.

– Пытаюць пра паступленне ў магістратуру, атрыманне другой вышэйшай адукацыі, мы кансультуем абітурыентаў пра правілы прыёму, спецыяльнасці, – дзеліцца **Наталля Мажэйка,** вядучы спецыяліст «Цэнтра кар'еры» з Галоўнага ўпраўлення адукацыйнай дзейнасці.

Для ўсіх ахвотнікаў зразумець сваё глыбіні Псіхалагічная служба БДУ сумесна са студэнтамі-псіхолагамі падрыхтавала невялікі квэст. На пяці станцыях трэба было выканаць нескладанае заданне, каб атрымаць кароткую псіхалагічную характарыстыку. Яе расшыфроўку даваў начальнік службы **Руслан Папок.** Наведнікаў не спыніла доўгая чарга, якая агінала пікеты. З філігранным майстэрствам, хутка прагартаўшы вынікі, Руслан Пятровіч выдаваў індывідуальны партрэт чалавека, і заўсёды дакладна. Звяртаў увагу на зоны росту і развіцця: як згладзіць вострыя рысы, што зрабіць, каб сябе гарманізаваць. Ацаніў псіхалагічнае майстэрства спецыяліста і рэктар БДУ **Андрэй Кароль.**

– Гэта экспрэс-дыягностыка. З розных дэталяў складаецца характарыстыка – вельмі мудрагелістае спалучэнне, якое можа расшыфраваць толькі спецыяліст. Самапазнанне – той першы крок, які робіць чалавек у развіцці, усё пачынаецца з разумення сябе. Без гэтага не выбудаваць ні кар'еры, ні сям'і. Калі чалавек уяўляе свае моцныя і слабыя бакі, становіцца зразумела, куды рухацца, – тлумачыць Руслан Папок.

Падчас шпацыраў па зонах актыўнасці можна было зрабіць высновы, што моладзевае жыццё ў БДУ шматстайнае. Гэта пацвердзілі нашы студэнты на спартыўных, танцавальных, інтэлектуальных, вакальных пляцоўках. Усе ахвотнікі маглі паспаборнічаць у аматарскім турніры па настольным хакеі, паказаць сябе ў футболе, баскетболе, дартсе, лазертагу, бадмінтоне. Можна было паўдзельнічаць у зумбе – танцавальнай фітнес-праграме на аснове папулярных лацінаамерыканскіх рытмаў.

Музыкі было шмат! На двух сцэнах выступалі творчыя калектывы і салісты БДУ. Папулярныя песні выканалі **Дзмітрый Нікановіч, Улад Макарэвіч, Лада Шчарбіцкая, Лера Макарэвіч, Дыяна Громава** і іншыя.

На «гістарычнай» пляцоўцы можна было палюбавацца на строі розных эпох: Першая і Другая сусветныя войны, напалеоніка, ВКЛ... Рэканструкцыяй займаюцца не толькі студэнты гістфака, але і кіраўнік тэатра «На філфаку» **Кацярына Тананайка.** Пяць яе асабістых убораў XIV стагоддзя, пашытых уручную, красаваліся на дзяўчатах.

Для аматараў фотаздымкаў былі падрыхтаваны шэсць фотазон, якія ўзнаўлялі студэнцкія будні. Маляўнічай была фотазона «Інфакуб БДУ», што дазволіла паглядзець на ўніверсітэт пад рознымі вугламі. Адзін бок паказваў дачыненне БДУ да космасу – гэта нанаспадарожнік і «Зорка БДУ» ў сузор'і Андрамеды. Таксама гэта сувязь з навукай, спортам і камунікацыяй. Адна частка куба была распісана папулярнымі хэштэгамі, самы вялікі з іх #БДУ. А купіць брэндзіраваныя рэчы можна было ў «Краме БДУ».

Працягнуўся фэст на галоўнай пляцоўцы стадыёна «Дынама». Тут разгарнуўся канцэрт з удзелам вядомых артыстаў. Яго хэдлайнерамі былі «J:Морс», «Каста», «Ляпіс-98», Святлана Лабада.

Bright Fest стаў своеасаблівым выпрабаваннем для «Дынама» перад правядзеннем II Еўрапейскіх гульняў. Фэст паказаў, што стадыён гатовы прымаць тысячы гасцей. Нагадаем, маштабнае спартыўнае спаборніцтва пройдзе з 21 па 30 чэрвеня. БДУ з'яўляецца афіцыйным партнёрам міжнароднага турніру і мае адну з самых прадстаўнічых дэлегацый валанцёраў на гэтых спаборніцтвах – звыш 1700 чалавек.

**Алена ЛЯЎШЭНЯ,**
**Надзея МАРХЕЛЬ**










УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

29 мая 2019 года
Падпісана да друку 28.05.2019 г.
Зак. 231. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспр. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*